М. Танцавальны фальклор // Традыцыйная мастацкая культура беларусаў. У 6 т. Т. 6. Кн. 2. Гомельскае Палессе і Падняпроўе. Мінск, 2013. *М.А.Козенка.*

**КАНАПЛЯ́НЫЯ ПЕ́СНІ**, к а н а п е л ь н ы я  п е с н і, група восеньскіх песень, што выконваліся, калі выбіралі каноплі. Працэс збору канапель пададзены ў песенных тэкстах апаэтызавана, спалучаецца з эстэтызацыяй любоўнага пачуцця, узмацняецца дзякуючы выкарыстанню псіхал. паралелізму ў адносінах паміж дзяўчынай і вобразам канапелькі, якая адушаўляецца: Ой, гаварыла канапелька, // Стоячы ў гародзе: // — Каб не тыя ціхія ветры, // Стаяла б, зімавала б, // Як сталі веяць, сталі павяваць — // Мусілі абламаці. // Ай, гаварыла маладая дзевачка: // — Каб не тыя добрыя людзі, // Жыла б я ў мамачкі, // Як сталі хадзіць, мамачку прасіць — // Мусілі з сабой узяці. У песнях «Чом вы, канапелькі, не зялёны стаіце?», «Калапніна ты зялёная» перадаецца гатоўнасць дзяўчыны да шлюбу іншасказальна, праз дзеяннідзеясловы з канапелькай: «веяць», «павяваць», «кляваць», «зламіць», «зімаваць», «прасіць», «насіць». Кампазіцыя песень разгортваецца на фоне канаплянага поля, а канапелька як вобраз дапамагае ў раскрыцці пачуццяў лірычнай гераіні, яе перажыванняў наконт будучага замужжа, прымае ўдзел у роздумах маладой жанчыны, якую «аддала»...«мамачка навек гараваці» з нялюбым. Вытворчы аспект толькі зрэдку заўважаецца ў К.п.: «Да ты, канапелька, // Да ты, зеляненька, // Ні сама не рвешся, // Ні мне не даешся...» Часцей за ўсё вобраз канапелькі бывае фонам, напр., у прадказанні нешчаслівага сямейнага жыцця зязюляй, на якую скардзіцца маці: ... — Бадай, зязюля, бадай шэрая, // Тут болей не лятала: // Адкукавала, адшчабятала // Дачушку-работніцу, // Прыкукавала, прышчабятала // Нявестку-ягодніцу. Маст. асаблівасцю К.п., як і ў многіх абрадавых і пазаабрадавых творах, з'яўляецца тое, што паэт. звароты, адрасаваныя дзеючым вобразам (канапелькі), ажыццяўляе нябачны персанаж-аўтар, які прадстаўляе народ (калект. творцу). Менавіта ён пытаецца: «Чом вы, канапелькі, не зялёны стаіце?» На гэта тыя (зноў жа, народ) адказваюць: — Як жа нам, канапелькам, зялёным стаяці? // Зверху канапелькі клююць вераб'і, // З ісподу канапелькі вада падмыла, // А ў сярэдзіне канапелькі хваля зламіла... К.п. былі распаўсюджаны на ПдУ Беларусі.

*Літ.*: Восеньскія і талочныя песні. Мінск, 1981; Л і с А.С. Восеньская каляндарная лірыка, яе тыпалогія і паэтыка // Каляндарна-абрадавая паэзія. Мінск, 2001. *А.М.Аляхновіч.*

**КАНА́Т**, тоўстая вяроўка, што выкарыстоўваецца на водным транспарце для замацавання якара, буксіроўкі барж і г.д. Уяўляе сабой гібкія вырабы са стальнога дроту, пражы раслiннага, мінеральнага альбо сінтэтычнага паходжання. Сыравінай для вітых К. былі пянька, луб ліпы. З іх на калаўроце скручвалі ніткі, у сасудзе з гарачай смалой варылі пражу, адціскалі, працягвалі праз адтуліну і прасушвалі. З нітак звівалі шнуры, з іх — вяроўкі, а з некалькіх вяровак скручвалі К., якія паліравалі, скручвалі ў кругі і везлі на продаж. На вырабе К. з даўніх часоў спецыялізаваліся канатчыкі. У канцы 18 ст. засн. канатныя мануфактуры Зорыча ў Шклове і Пацёмкіна ў Крычаве, дзе выраблялі К. для патрэб Чарнаморскага флоту. Канатныя прадпрыемствы, якія належалі купцам і мяшчанам, у 2-й пал. 19 ст. дзейнічалі ў Ветцы, Прапойску, Бялынічах, Віцебску, Рагачове і інш. У Віцебску налічвалася 15 невял. канатных заводаў. У наш час К. выробляюць на прам. прадпрыемствах з сінтэтычнай сыравіны. *Н.І.Буракоўская.*

**КАНАТА́ЦЫЯ** (лац. connotatio ад con разам + noto адзначаю, абазначаю), дадатковыя семантычныя або стылістычныя адценні, якія накладваюцца на асн. значэнне моўнай адзінкі і служаць для стварэння экспрэсіўна-эмацыянальнай афарбоўкі выказвання. Дапаўняе прадметна-паняційны (дэнатацыйны) і граматычны змест моўнай адзінкі: *ліс(а)* — «пра хітрага, каварнага чалавека», *языкасты* — «балбатлівы, гаваркі», *упарты, як асёл* (параўн.: *асёл* — «упарты і/або тупы чалавек») і інш. Вылучаюць 2 тыпы К.: у з у а л ь н у ю (інгерэнтную, парадыгматычную), або ўнутрана ўласцівую слову, і а к а з і я н а л ь н у ю (адгерэнтную, кантэкстуальную), або набытая словам у кантэксце. Традыцыйна адрозніваюць 2 віды ўзуальнай К. Першы ахоплівае лексічныя адзінкі з узуальна-абумоўленым канатацыйным значэннем, у якіх канатацыйны кампанент прысутнічае ў значэнні слова як яго пастаянны элемент [«бамбіза», «языкасты», «мямліць», «сынок», «зяцёк», «разгалачыцца», «бугай» (перан.), «пешка» (перан.), «каркаць» (перан.)], другі — уключае словы з К., якая патэнцыяльна суправаджае слова ў мове, носіць агульнавядомы характар і ў любы момант можа быць актуалізавана ў пэўных кантэкстуальных умовах. Гэта словы з узуальна-актуалізаваным канатацыйным значэннем (*мужчына* — 'сталы, мужны, які вылучаецца рыцарскімі паводзінамі', *настаўнік* — 'той, хто не толькі вучыць, а накіроўвае, перадае свой вопыт, цяпло сваёй душы, дае кірунак у жыцці', *чалавек* — 'асоба як выражэнне высокіх маральных і інтэлектуальных рыс, духоўных якасцей'), а таксама т.зв. арэольныя і канцэптыўныя словы («кулак», «фашыст», «гуманіст», «інтэлігент», «апазіцыя»).

*Літ.*: С я н к е в і ч В. Семантыка і прагматыка беларускай мовы. Брэст, 1995; Д о ў г а л ь А. Сродкі выражэння эмоцый у сучаснай беларускай мове. Мінск, 2008. *Н.П.Лобан.*

**КАНА́ТЧЫКІ**, л і н н і к і, рамеснікі і рабочыя на канатных заводах, якія рабілі *канаты*. К. ўпамінаюцца ў дакументах рамесных цэхаў Беларусі 16—17 ст. Цэнтрам рамяства з канца